Інфармацыйная культурна-грамадская газета Гарадоччыны

ГАСЦІНЕЦ



№ 1 (226) СТУДЗЕНЬ 2017 ГОДА

БЕЛАРУСКАЯ ПРЫМАЎКА

Добрае доўга помніцца, а дрэннае ніколі не забудзеш

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА

ДЗІЎНЫЯ СУАДНОСІНЫ ЛІЧБАЎ МАЛОЧНАЙ ГАЛІНЫ

Нацыянальны статыстычны камітэт апублікаваў дадзеныя асноўных паказчыкаў развіцця Гарадоцкага раёну за 11 месяцаў 2016 года. Пэўныя пытанні выклікаюць даныя аб стане малочнай галіны Гарадоччыны.

З мінулага лета са старонак газеты «Гарадоцкі веснік» зніклі даныя аб развіцці малочнай галіны Гарадоцкага раёна ў разрэзе сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Гэтыя даныя зніклі, бо былі супярэчлівымі і не адпавядалі здароваму сэнсу, бо за наступны месяц даваліся даныя меншыя, чым ужо было надоена раней.

І вось не менш «арыгінальныя» лічбы з'явіліся сярод даных Нацыянальнага статыстычнага камітэту за 11 месяцаў 2016 года па Гарадоцкаму раёну. Па-першае варта парадавацца за тое, што ўпершыню за многія гады не адбылося далейшага скарачэння малочнага статка Гарадоччыны: колькасць каро на фермах павялічылася з 5608 у 2015 годзе да 5655 у мінулым годзе — на 47 галоў. Пры гэтым таксама выраслі і надоі ў сярэднім з адной каровы — з 4058 кг за 11 месяцаў да 4122 кг — +64 кг.

Але пры павелічэнні статка і надоеў на адну карову рэалізацыя малака скарацілася аж на 1 237(!) тон: з 24 083 тон да 22 846 тон за 11 месяцаў 2016 года. Канешне, спецыялісты сельскагаспадарчай вытворчасці маюць такую магчымасць, як выкарыстанне здыбытага мала на сельскагаспадарчыя патрэбы і г.д., каб паказваць валавы рост малака. Але ж не да такіх жа памераў... Дарэчы гэтая дыспрапорцыя ў малочнай галіне Гарадоччыне выяўляецца ў статыстычных даных не адзін месяц.

Л. Антонаў

РЫНАК ПРАЦЫ

ВОЛЬНЫЯ МЕСЦЫ – НА ПАЎСТАЎКІ

Галоўным працадаўцам у раёне на пачатку года стаў Гарадоцкі аддзел адукацыі, спорту і турызму. У базе дадзеных Дзяржаўнай службы занятасці па Гарадоцкаму раёну маецца 158 вакансій. Пры гэтым самая вялікая колькасць вакансій прапануецца ў бюджэтных аддзелах Гарадоцкага райвыканкаму і ў падраздзяленнях Гарадоцкай райбальніцы.

Па стану на 4 студзеня ў базе дадзеных утрымліваецца 44 вакансіі Гарадоцкага аддзела адукацыі, культуры і турызму. Пераважная колькасць вакансій не на поўную стаўку, а на 0,5 ці 0,25 стаўкі. Сярод гэтых ставак звяртае ўвагу вакансіі інжынера-праграміста ў СШ № 1 г. Гарадка і Езярышчанскай СШ з заробкам у 239,48 рублёў.

У структурах Гарадоцкага аддзела па ідэалогіі, культуры і моладзевых справах маецца 18 вакансій у асноўным у сферы культуры і таксама з занятасцю на 0,5 стаўкі. Сярод гэтых прапаноў маецца аж пяць прапаноў для акампаніятараў з заробкам 119,74 руб., а таксама пяць загадчыкаў клубаў, філіялаў з тым жа заробкам. У структурах Гарадоцкай райбальніцы таксама маецца 18 вакансій.

Ранейшыя лідэры па працоўных вакансіях свінакомплекс «Паўночны» і Гарадоцкі лясгас зараз прапануюць працу толькі па 7 і 3 вакансіях. А самыя даўнія прапановы ў базе даных цягнуцца ад 24 жніўня ад Гарадоцкай санстанцыі па 7 вакансіях.

Сярод прапануемых вакансій мусіць самая вялікая колькасць працоўных месцаў датычыцца вакансіі швачак у філіяле «Віцебчанкі» у Гарадку — 7 месцаў з абяцаным заробкам у 300 руб.

Нагадаем, што афіцыйная колькасць беспрацоўных у раёне на канец лістапада склала 86 чалавек.

Л. Антонаў

ЗНАЧНА БОЛЬШ НАВІНАЎ ПРА ГАРАДОК НА HARADOK.INFO

ЗДАРЭННЕ

ЗАМЕРЗЛІ Ў ДОМЕ

Трагічны выпадак адбыўся ў в. Верамеева Першамайскага сельсавета, дзе пасля Ражства быў выяўлены замерзлы труп 54-гадавога грамадзяніна, а яго 48-гадовы сабутэльнік быў знойдзены з вялікімі абмарожаннямі.

«Гарадоцкі веснік» паведаміў пра трагічны выпадак, які адбыўся ў в. Верамеева Першамайскага сельсавета з двумя сабутэльнікамі. Пачаўшы адзначаць Новы год двое беспрацоўных не маглі спыніцца ў распіцці спіртных напояў і пры гэтым перасталі атапліваць дом з 3 студзеня. Не было бачна дыму з дома і на вялікія маразы ў мінулыя выхадныя. А калі 8 студзеня суседзайшоўудом,тознайшоў замерзлы труп гаспадара і ледзь жывога сабутэльніка з вялікімі абмарожаннямі. Гэты сабутэльнік не мог ні дапамагчы гаспадару, ні пазваць на дапамогу..

Па словах следчага Гарадоцкага раённага следчага камітэта на момант агляду дома тэмпература складала толькі –10 градусаў па Цэльсію.

Т. Гаражанка

СЛОВА ПІСЬМЕННІКА

УЛАДЗІМІР АРЛОЎ ПАВІНШАВАЎ СУАЙЧЫННІКАЎ

Дарагія сябры!

Напэўна, нікога не трэба пераконваць, што разам з целам і душой найвялікшай каштоўнасцю для чалавека ёсць час. Прычым перад навагоднімі святамі я заўсёды здзіўляюся, што хвіліны могуць цягнуцца бясконца доўга, а гады пралятаюць неверагодна імкліва.

Як і кожны год, 2016-ты быў годам набыткаў і стратаў.

Сярод нашых цяжкіх стратаў сыход у вечнасць народнага паэта Ніла Гілевіча, які сваім талентам жывіў мову і літаратуру, а сваёй грамадзянскай пазіцыяй бараніў незалежнасць. Заўчасна спынілася вялікае беларускае сэрца даследчыка сталінскіх злачынстваў Леаніда Маракова, што аднавіў праўду пра дзясяткі тысяч лёсаў, перакручаных у крывавых жорнах бальшавіцкага тэрору. Асабіста я ўдзячны Леаніду за дапамогу ў пошуках справы майго дзеда Максіма, расстралянага ў 1933-м.

Але найперш прамінулы год застанецца ў памяці падзеямі жыццясцвярджальнымі.

Мы святкавалі 25-годдзе незалежнасці, узгадвалі тыя радасныя дні, калі на палітычнай карце свету з'явілася Рэспубліка Беларусь. Вырасла цэлае пакаленне беларусаў, для якіх жыць у незалежнай дзяржаве ўжо гэтаксама натуральна, як дыхаць. Такое шчасце яны не аддадуць нікому.

Думаю, што ў новай геапалітычнай сітуацыі, калі і далёка, і зусім блізка ад нас ідзе вайна, мы пачалі глыбей асэнсоўваць перавагі жыцця ў нейтральнай безядзернай краіне і значна больш цаніць свой суверэнітэт. Гэта адчуваецца і ў грамадстве, і на самых высокіх паверхах улады.

Аднойзгалоўныхпадзей2016-га я лічу захады, зробленыя ўладай у дачыненні тых, хто зневажае нашу нацыянальную годнасць і выступае супраць беларускай дзяржаўнасці.

Упрамінулымгодзедзякуючы часопісу «Імёны» мы распяхова збіралі грошы для дзяцей-сірот і інвалідаў, а праз кампанію з красамоўнай назваю «Талака» ахвяравалі сродкі на культурніцкія праекты. Гэта надзвычай важныя праявы беларускай салідарнасці.

Рэжысёр Мікалай Пінігін у 2016-м паставіў на купалаўскай сцэне спектакль «Дзве душы» паводле забароненай на доўгія дзесяцігоддзі аповесці Максіма Гарэцкага.

У прамінулым годзе ў нас з'явіліся новыя беларускія грошы без вусцішнага ланцужка нулёў. Хтосьці кажа, што купюры занадта падобныя да еўра, але мне гэта якраз даспадобы.

Новы год будзе багаты на круглыя і важкія гістарычныя даты. Змяніць сённяшні дзень праз мінулае немагчыма, але, звяртаючыся да гісторыі, мы можам больш дакладна вызначыць каардынаты свайго быцця і зрабіць больш правільны выбар.

У 2017-м — стогадовы юбілей нашага бел-чырвона-белага сцяга. Мы будзем адзначаць і 100-годдзе Першага Усебеларускага з'езда, дзе прагучаў заклік «Няхай жыве Беларуская Народная Рэспубліка!».

Але, бясспрэчна, галоўнай гістарычнай падзеяй будзе 500-годдзе беларускага кнігадрукавання.

Адначасова гэта і 500-годдзе беларускай Біблії, чацвёртай у свеце Біблії, надрукаванай на жывой мове народа. Подзвіг Францішка Скарыны яшчэ раз нагадвае нам, што мы — еўрапейцы. Ці хопіць нашай уладзе мудрасці годна адзначыць векапомную дату? Ці атрымае мінскі міжнародны аэрапорт імя Скарыны?

Ці з'явіцца ўказ, які абвесціць 6 жніўня, калі пабачыла свет першая беларуская кніга, Днём друку?

Зусімхуткастрэлкігадзіннікаў пачнуць адлік першых хвілінаў новага года. Няхай ён будзе напоўнены новымі добрымі справамі, каханнем і сяброўствам! Няхай стане яшчэ адным крокам да той Беларусі, пра якую мы марым!

І зноў, як заўсёды ў такія дні, я згадваю сваю незабыўную бабулю — добрую вядзьмарку і шчырую вернiцу. Бабуля любіла казаць: «Мы жывём у хаце, над намі жыве гарышча, над гарышчам — неба…».

Высокага вам неба, дарагія суайчыннікі!

З Новым годам!

http://nn.by

Аб'ява

Аператыўная інфармацыя аб падзеях Гарадоччыны, рэгіёна і больш, чым у газеце, зараз па-беларуску і па-расейску з'яўляецца на новым Інтэрнэт рэсурсе: http://haradok.info

****

Наша газета "Гасцінец" пачала размешчацца на партале http://haradok.info ў раздзеле "Газета "Гасцінец", дзе ствараецца архіў за мінулыя гады.

****

Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Гасцінец» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – і вы яго атрымаеце. Калі ўжо не жадаеце атрымліваць выданне, то патэлефануйце у рэдакцыю.

БРАКАНЬЕРСТВА

НЕЗАКОННА ЗДАБЫВАЛІ РАКАЎ

Пяць жыхароў Віцебскай вобласці абвінавачваюць у незаконнай здабычы ракаў. З іх трое здабывалі ракаў у Гарадоцкім раёне

З матэрыяламі крымінальнай справы аб незаконнай рыбалцы знаёмяцца тры жыхары Віцебска, якіх абвінавачваюць у незаконнай лоўлі ракаў. 33-гадовы, 34-гадовы і 44-гадовы мужчыны ў верасні 2016 года рана раніцай прыехалі на возера Лосвіда ў Гарадоцкім раёне, захапіўшы з сабой дзве гумовыя надзіманыя лодкі.

Не маючы дазволу на здабычу і выкарыстоўваючы забароненыя прылады — 13 ракаловак, за некалькі гадзін мужчыны незаконна вылавілі 339 асобін вузкапалага рака вагой больш за 18,5 кг. Пры гэтым 158 асобнікаў з'яўляліся яйценоснымі самкамі. Шкоду навакольнаму асяроддзю ацанілі — больш за 20 600 рублёў.

Калі рыбакі з уловам выйшлі на бераг, іх затрымалі супрацоўнікі Гарадоцкай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету. Затрыманыя спрабавалі пазбавіцца ад часткі ўлову, але спецыялісты выявілі ўсіх здабытых імі ракаў. Гумовыя лодкі, ракалоўкі у ў іх канфіскавалі і прызналі рэчавымі доказамі.

Следчыя таксама наклалі арышт на маёмасць абвінавачаных на суму больш за 12 тысяч рублёў. У прыватнасці, арыштаваныя 2 аўтамабіля.

Упраўленне Следчага камітэта па рэгіёне таксама расследавала крымінальную справу ў дачыненні да двух жыхароў Лепельскага раёна, якія незаконна здабылі ракаў, паведаміла TUT.BY афіцыйны прадстаўнік УСК па вобласці Святлана Сахарава.

У верасні мінулага года 34-гадовы і 36-гадовы мужчыны днём прыехалі на возера Шчыбат ў 10 км ад Лепеля, каб лавіць ракаў. Для гэтага яны арандавалі драўляную лодку. У мужчын таксама меўся рыштунак для апускання пад ваду, але не было дазволу на здабычу водных жывёл.

Адзін з мужчын вылавіў рукамі 293 асобіны вузкапалага рака вагой больш за 13 кг. Сваю здабычу сябры прынеслі на бераг, дзе каля хаткі на лодкавай станцыі ў вёсцы Бароўка іх затрымалі супрацоўнікі Лепельскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету. Шкода прыродзе склала больш за 9 тысяч рублёў.

Следчыя прад'явілі ім абвінавачанне за незаконную здабычу іншых водных жывёл, без належнага на тое дазволу, што пацягнула прычыненне шкоды ў асабліва буйным памеры. Мужчыны знаходзяцца пад падпіскай пра не выезд. Крымінальная справа перададзена пракурору для накіравання ў суд.

https://news.tut.by

ПАЖАРЫ

МАРОЗНАЙ НОЧЧУ АДБЫЛОСЯ ДВА ПАЖАРЫ

Паводле даных прэс-службы Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС гэтай ноччу ў г.п. Езярышчы і в. Вялікія Стайкі адбылося два пажара без чалавечых ахвяр

7 студзеня на Ражство ў 20-12 паступіла паведамленне аб пажары дома ў г.п. Езярышча Гарадоцкага раёна. У выніку пажару ў доме 7×12 м, які належыць грамадзяніну, 1981 г.н., работніку ТЦСО Гарадоцкага раёна знішчаны дах, столевае перакрыцце, пашкоджаныя сцены, маёмасць. Прычына пажару высвятляецца.

А 8 студзеня глыбокай ноччу ў 2-12 паступіла паведамленне пра пажар дачнага дома ў в. Вялікія Стайкі Вайханскага с /с. У выніку пажару ў доме 6×9 м, які належыць грамадзяніну, 1958 г. н, пенсіянерцы, знішчаны дах, столевае перакрыцце, пашкоджаныя сцены, маёмасць. Прычына пажару высвятляецца.

Нагадаем, што гэтай ноччу ў Віцебскай вобласці яшчэ два пажары ў Талачынскім і Віцебскім раёнах прывялі да двух чалавечых ахвяр. Усяго ў вобласці адбылося сем пажараў — пераважна ва ўсходніх раёнах вобласці.

Т. Гаражанка

Паводле: http://mchs.gov.by

ЗАГІНУЎ 50-ГАДОВЫ ГРАМАДЗЯНІН

Паводле інфармацыі прэс-службы Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС ноччу ў Езярышчы ў выніку пажара загінуў сын гаспадыні грамадзянін 1967 г.н.

6 студзеня ў 02-51 паступіла паведамленне аб пажары ў жылым доме ў г.п. Езярышча па вул. Ленінскай.

Пры тушэнні пажару высветлілася, што ў агні загінуў сын гаспадыні, грамадзянін 1967 г.н.

Прычына пажару высвятляецца.

Л. Антонаў

Паводле: mchs.gov.by

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

«МУЖЫКІ ПІЦЬ СТАЛІ МЕНШ»

Другі месяц ваўкі трымаюць у страху некалькі вёсак на поўначы Віцебскай вобласці. Галодныя драпежнікі з надыходам цемры выходзяць з лесу і загрызаюць сабак. Больш за ўсё ад нашэсця драпежнікаў пакутуюць жыхары вёскі Газьба на Гарадоччыне, піша «СБ Беларусь Сегодня».

— Страшна ў нас. Не прыязджайце, — гэта першае, што я пачула ад мясцовага заўмага Марыны Данілавай у адказ на маю прапанову заехаць у Газьбу. — На днях сусед бачыў, як тры ваўкі гналі па вёсцы лася. Пастукаў сякерай аб жалязяку, драпежнікі спалохаліся — і ў лес. Мы спалохаліся. Пасля шасці гадзін на двор больш ні-ні.

Ваўкі тым часам устанаўліваюць у вёсцы свае парадкі.

«Хто так бязлітасна расправіўся з любімым Жучком?» — першае, пра што падумала Галіна Страчыла, калі раніцай знайшла раскіданыя па падворку астанкі і кроў. Гаспадыня да гэтага часу не адыходзіць ад пустой будкі, аплаквае чацвераногага вартаўніка.

Шэрыя разбойнікі не думаюць адступаць і ледзьве не кожную ноч тэрарызуюць адзінокую жанчыну: чуючы здабычу, шныраць ля адрыны, дзе зімуюць нясушкі. Жучок стаў не адзінай ахвярай драпежніка — у навакольных вёсках ваўкі загрызлі з дзясятак сабак. Уцалелых гаспадары закрываюць у хлявах ці забіраюць у хаты.

Апусцелымі сабачымі будкамі ў Газьбе нікога не здзівіш.

— Жудасць, — адным словам апісала сітуацыю Галіна Страчыла.

Жанчына працуе паштальёнам: «У мяне абход 6–7 кіламетраў, усё — па прасёлкавых дарогах. Бывае, ідзеш, а яны (ваўкі. — заўвага аўтара) за табой увяжуцца, праследуюць. Метраў за 20–25 трымаюцца, бліжэй не падыходзяць. Тут галоўнае не панікаваць: паскорыш хаду ці пабяжыш — і яны нападуць.

Прэцэдэнты ёсць. Мінулай зімой у вёсцы Пальмінка ў Гарадоцкім раёне зграя ваўкоў напала на маладога чалавека па дарозе дадому. Ён паспеў залезці на дрэва, але ногі яму пагрызлі. Добра яшчэ, што з сабой у хлопца быў мабільны тэлефон, ён выклікаў сяброў і «хуткую».

— Такога кашмару ў акрузе даўно не было, — разводзіць рукамі 85-гадовая Клаўдзія Будаева. — У вёсцы сабак няма. Усіх паелі.

За сябе пенсіянерка не хвалюецца, кажа, пажыла сваё. А за ўнучку Ксюшу душа не на месцы: кожную раніцу дачка вядзе вучаніцу 2-га класа да аўтобуснага прыпынку, да якога не менш за кіламетр па неасветленай вясковай вуліцы.

Шмат хто ў вёсцы баіцца адпускаць дзяцей у школу.

— Адных дзяцей не адпускаем, ідзём да прыпынку разам з імі, — расказвае Марына Данілава. — Вадзіцель аўтобуса, дзякуй яму вялікі, стаў пад'язджаць да самай вёскі, дзецям хоць праз лес да дарогі не трэба ісці. А яшчэ музыку ўключаем у гаджэтах грамчэй — не ваўкі таксама не любяць. Сусед наш Рашыд Абусадавіч праводзіць унука-сямікласніка ў школу з факелам — пах гару не падабаецца драпежнікам.

Другі месяц з надыходам цемры на вуліцах Газьбы — ні душы, а па вечарах у вёсцы чуюць толькі воўчае выццё. Жыхарам нічога не застаецца, акрамя як абараняцца ўсімі падручнымі сродкамі. Уся надзея — на вілы і сякеры.

Навагодняя ілюмінацыя ў Газьбе гарыць ночы напралёт: агні гірлянд драпежнікам таксама не даспадобы. А сяльчанка Алена Сухарукава прыслухалася да парад паляўнічых і развесіла ўздоўж хлява з авечкамі чырвоныя анучы — каб адпудзіць няпрошаных лясных гасцей. Не дапамагло.

Такія воўчыя сляды зранку знаходзяць вяскоўцы каля сваіх дамоў і хлявоў.

— Мужыкі піць сталі менш, — сяльчанка шукае хоць нейкія плюсы ў гэтай сітуацыі. — Раней, бывала, накацяць і спяць у гурбе. А тут яшчэ святы! Цяпер баяцца. У гэтую навагоднюю ноч па вуліцы ніхто не боўтаўся.

Галодныя драпежнікі тэрарызуюць таксама і некалькі бліжэйшых вёсак: Мяжу, Зайкава, Лугаўскія... А ў святочныя выхадныя ў вёсцы Віраўля зграя шэрых выцягнула праз вакно адрыны і разадрала дзвюх авечак.

Дырэктар гарадоцкай філіі «Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў» Юрый Лявонаў тлумачыць небывалую агрэсію ваўкоў голадам — нядаўна ў лесе скарацілі колькасць кабаноў:

— За мінулы год адстралялі па ўсім раёне 21 ваўка, плюс тры падранкі. У канцы студзеня-пачатку лютага ў іх пачынаецца гон, тады і пачнём масавы адстрэл. Што датычыцца Газьбы, то я бачу дзве прычыны такога становішча. Па-першае, зараз маладняк пачаў выходзіць на паляванне, вучыцца. Па-другое, Газьба знаходзіцца ў пяці кіламетрах ад расійскай мяжы, воўк свабодна заходзіць і сыходзіць. Мы тут яго адстрэльваем, а як ідуць справы на тым баку — невядома.

Пакуль паляўнічыя не вырашаць «воўчую» праблему, Юрый Лявонаў раіць вяскоўцам быць асцярожнымі, асабліва ў начны час, калі драпежнік найбольш актыўны.

Інна Гарбаценка

СБ Беларусь Сегодня

АЎКЦЫЁН

ДЗІЦЯЧЫ САДОК НА ПРОДАЖ

Першым абектам Гарадоцкага раёна ў гэтым годзе на аукцыёне стане будынак дзіцячага садка амаль за 20 тысяч рублёў. 9 студзеня фонд «Віцебскаблмаёмасць» правядзе аукцыён, дзе першым лотам будзе невыкарыстоўваемы будынак дзіцячага садка ў в. Новы Болецк Стадалішчанскага сельсавета за 19 882, 34 рубля. Пры гэтым першапачатковы кошт маёмасці зніжаны на 20%.

Характарыстыка дадзенай нерухомасці такая. Гэта капітальны будынак (будынак дзіцячага садка) з агарожай, адрынай, ганкам — аднапавярховы цагляны, агульнай плошчай 188,4 кв.м, падмурак бетонны стужачны, 1965 г. пабудовы.

Будынак дзіцячага садка не зарэгістраваны ў адзіным дзяржаўным рэгістры нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёю.

Зямельны ўчастак для абслугоўвання будынкаў былога дзіцячага сада з адрынай і агарожай мае плошчу 0,1447 га і прадстаўляецца ў арэнду на 50 гадоў. Абмежаванні ў выкарыстанні выкліканы размяшчэннем зямельнага ўчастка ў водаахоўнай зоне воз. Болецкае. Сума задатку для ўдзелу ў аукцыёне складае 3 976,00 рублёў.

Як заведзена ў беларускай сістэме аукцыёнаў, удзельнік, які стаў пераможцам аўкцыёну, пасля заканчэння аўкцыёну абавязаны: падпісаць пратакол аўкцыёну; не пазней за 10 рабочых дзён пасля зацвярджэння ва ўстаноўленым парадку пратаколу аўкцыёну кампенсаваць затраты на арганізацыю і правядзенне аўкцыёну, уключаючы расходы, звязаныя з вырабам і прадастаўленнем удзельнікам дакументацыі, неабходнай для яго правядзення. Таксама пераможца абавязаны не пазней за 12 рабочых дзён з дня зацвярджэння ва ўстаноўленым парадку пратаколу аўкцыёну заключыць damову куплі-продажу нерухомасці і дагавор арэнды зямельнага ўчастка.

Л. Антонаў

БЕЛАРУСЬ – РАСІЯ

ЧАМУ «НАФТАГАЗАВАЯ ВАЙНА» НАБЫВАЕ ЗАЦЯТЫ ХАРАКТАР?

Гледзячы па ўсім, чарговая беларуска-расейская «нафтагазавая вайна» перайшла ў вострую стадыю. Найбольш яскравымі прыкметамі гэтага стаў байкот А. Лукашэнкам самітаў ЭАЭС і АДКБ у Санкт-Пецярбургу, ягоная адмова падпісваць Мытны кодэкс саюзу, пераход кіраўніка Беларусі да звыклай канфрантацыйнай рыторыкі: «Мы нікому не дазволім зьневажаць наш народ і дзяржаву. Калі хтосьці гэтага не разумее, тады нам няпроста будзе зь імі ня тое што строіць стасункі, але і размаўляць». Ну і адразу з Масквы прайшоў жорсткі адказ: Расея яшчэ больш скараціла пастаўкі сваёй нафты Беларусі ў першым квартале.

Як і прынята на вайне, зьявіліся ваеннапалонныя (тры арыштаваныя блогеры сайта «Рэгнум»). Праўда, Расея іх не прызнала. Паводле савецкай традыцыі сталінскіх часоў Масква вуснамі афіцыйных асобаў заявіла: у нас няма палонных, ёсьць экстрэмісты.

За часы А. Лукашэнкі Беларусь і Расея перажылі некалькі вострых міждзяржаўных канфліктаў. У 1997 годзе крызыс у двухбаковых дачыненьнях здарыўся з нагоды арышту беларускімі ўладамі карэспандэнта ОРТ Паўла Шарамета. У 2002 і 2004 гг. адбыліся канфлікты праз газавыя цэны, у апошнім выпадку Расея адключыла пастаўкі газу, што Лукашэнка ацаніў як «акт тэрарызму на высокім узроўні». На мяжы 2006-2007 гадоў разгарнулася вострая «нафтагазавая вайна» з перакрыцьцём трубаправодаў і чарговымі скандальнымі заявамі. У 2009 г. дзьве краіны перажылі «малочную вайну», тады Лукашэнка таксама байкатаваў саміт АДКБ у Маскве, нейкі час адмаўляўся падпісваць дамову аб стварэньні Калектыўных сілаў апэратыўнага рэагаваньня. Крызысу ў двухбаковых дачыненьнях 2010 году спадарожнічала інфармацыйная вайна, паказ на НТВ тэлесэрыялу «Хросны бацька».

Чым цяперашні канфлікт адрозьніваецца ад папярэдніх? Найперш іншым гістарычным кантэкстам.

Па-першае, Расея рэзка ўзмацніла сілавы кампанэнт у сваёй замежнай палітыцы, што спарадзіла ўкраінскі крызыс, «халодную вайну» з Захадам.

Па-другое, Беларусь у гэтых канфліктах РФ са сьветам заняла пазыцыю нэўтралітэту.

Па-трэцяе, падзеньне сусьветных цэнаў на нафту пацягнула за сабой эканамічны крызыс у ЭАЭС, зьмяншэньне расейскага энэргетычнага гранту Беларусі.

Па-чацьвёртае, усё гэта супала з вострым крызысам беларускай сацыяльнай мадэлі.

Па-пятае, выбух шавіністычнай хвалі ў Расеі, на тле якой нэўтралітэт найбліжэйшага саюзьніка, ягонае пэўнае дыстанцыяваньне ад Масквы разглядаецца ў палітызаванай частцы расейскага грамадзтва як «бандэраўшчына».

Як гэта ўсё ўплывае на цяперашні беларуска-расейскі канфлікт?

Дзьве найбольш важныя высновы. Расейскія эканамічныя субсыдыі Беларусі сталі меншыя, а патрэбы Беларусі ў дапамозе ў сувязі з крызісам апынуліся большымі. Гэтыя супрацьлеглыя трэнды прыйшлі ў вострую супярэчнасьць. Што і вылілася ў жорсткую спрэчку пра цэны на газ.

Другі момант. Большая незалежнасьць Беларусі ад Расеі ў замежнай палітыцы (нармалізацыя стасункаў афіцыйнага Менску з Захадам, нэўтралітэт у канфліктах паміж РФ з ЗША і ЭЗ) адбываецца на фоне павялічэньня эканамічнай залежнасьці Беларусі ад усходняга суседа. Нагадаю, доля Расеі ў таварным экспарце Беларусі вырасла летась да 46%, хоць у 2015 годзе гэтая лічба складала 39%. Зноў два супрацьлеглыя трэнды. Лягічна, што ў Крамлі палічылі, што моцна залежны саюзьнік павінен дэманстраваць ляяльнасьць. Бо някіраваны сатэліт — гэта нонсэнс.

І на нейкім этапе гэтыя аб'ектыўныя рознавэктарныя тэндэнцыі павінны былі выклікаць канфрантацыю ў двухбаковых дачыненьнях. Што мы цяпер і назіраем. Таму канфлікт і набывае такі зацяты характар, што ў ягонай аснове ляжаць аб'ектыўныя чыньнікі.

Валер Карбалевіч
"Радыё Свабода"

ЗВАРОТ

5 ЦЫТАТ ЛУКАШЭНКІ З НАВАГОДНЯГА ЗВАРОТУ

Аляксандар Лукашэнка традыцыйна павіншаваў беларусаў з Новым годам. Свабода выбрала 5 найбольш цікавых цытат Лукашэнкі са сьвяточнай прамовы.

1. «Мы сталі закладнікамі»

Кажучы пра эканамічныя праблемы, Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што яны былі выкліканыя крызысам у «нашых традыцыйных эканамічных партнэраў».

«Сувэрэнная і незалежная Беларусь апынулася ў эпіцэнтры сусьветных геапалітычных і эканамічных падзей. Мы жывём у адкрытай краіне і перш за ўсё таму сталі заложнікамі той эканамічнай сытуацыі, якая склалася ў нашых традыцыйных эканамічных партнэраў», — адзначыў ён.

2. «Мы, людзі ў пагонах, ведаем: порах трэба трымаць сухім»

Кажучы пра зьнешнія пагрозы, Лукашэнка назваў сябе чалавекам «у пагонах»: «Захаваць Беларусь астраўком стабільнасьці і спакою было няпроста. Але мы гэта зрабілі, забясьпечыўшы мір і бясьпеку грамадзян! Нашы суседзі, сябры, брацкія народы павінны ведаць, што зь беларускай зямлі ніколі ня будзе агрэсіі і пагроз. У той жа час мы, людзі ў пагонах, ведаем: порах трэба трымаць сухім. Абарона Айчыны — наш сьвяшчэнны абавязак!».

3. «Беларусь набывае ўсё больш сучаснае эўрапейскае аблічча»

Лукашэнка заявіў, што 2017 год «павінен стаць пераломным і даць магутны імпульс для разьвіцця краіны». Паводле яго слоў, стаўка будзе зробленa на стварэньне новых вытворчасьцяў і працоўных месцаў, актывізацыю бізнэсу.

«Мы ствараем новыя вытворчасьці, будуем дарогі, электрастанцыі, важныя сацыяльныя аб'екты і жылыя дамы. Добраўпарадкоўваем гарады і вёскі. З кожным годам Беларусь набывае ўсё больш сучаснае эўрапейскае аблічча», — падкрэсьліў ён.

4. «Мы ўжо ў надыходзячым годзе істотна павысім даходы грамадзян»

Лукашэнка паабяцаў у 2017 годзе істотна павысіць даходы беларусаў, хоць сярэдні заробак у 500 даляраў згаданы ня быў: «Узровень жыцьця народа павінен быць значна вышэйшым, чым сёньня. Дасягнуць гэтага няпроста. Аднак чаго б нам ні каштавала, мы ўжо ў надыходзячым годзе істотна павысім даходы грамадзян».

5. «Старэйшае пакаленьне шмат зрабіла для нашай краіны, але цяпер трэба рухацца далей»

Лукашэнка зрабіў акцэнт у сваёй прамове на асаблівым значэньні для Беларусі маладога пакаленьня: «Старэйшае пакаленьне шмат зрабіла для нашай краіны. І мы ўдзячны ім за гэта. Але цяпер трэба рухацца далей, укараняць у жыцьцё ўсё больш прагрэсіўнае і карыснае. А для гэтага трэба вучыцца, удасканальвацца, ісьці ў нагу з часам. Свае слова павінна сказаць наша моладзь, патрыятычная, неабыякавая да лёсу сваёй Радзімы. Сярод вас шмат здольных людзей».

www.svaboda.org

ПЕНСІЯНЕР І ПРАЦА

«ПЭНСІЯНЭРАЎ, ЯКІЯ ПРАЦУЮЦЬ, У НАС УДВАЯ БОЛЬШ, ЧЫМ У ПОЛЬШЧЫ»

Кожны чацьвёрты беларускі пэнсіянэр працягвае працаваць. Як гэта можа адбіцца на эканоміцы і рынку працы? Абмяркоўваюць Уладзімер Глод, Дзьмітры Гурневіч, Ігар Карней.

Гурневіч: Паводле афіцыйнай статыстыкі, 25% беларусаў, то бок кожны чацьвёрты, пасьля выхаду на пэнсію застаецца працаваць. Гэта больш за 665 тысяч чалавек з агульнага ліку больш за 2,5 млн чалавек. Прычым за год гэты паказьнік павялічыўся прыблізна на 15 тысяч. Асабліва вялікая частка людзей застаецца ў галіне адукацыі і сацыяльнага абслугоўваньня.

Гэта ня дзіўна. Сярэдняя пэнсія ў Беларусі не дацягвае і да 150 даляраў. Раней казалі, што ў вёсцы за такія грошы яшчэ пражыць можна, а вось у горадзе — не. Раней дзяржаўная прапаганда сьцьвярджала, што пэнсіянэры краін Балтыі зайздросьцяць беларускім, маўляў, усё у іх таннае і пэнсія годная. Але ўсё хутка зьмянілася і сёньня беларускія пэнсіянэры ўжо ня ўзор.

Працаваць на пэнсіі — не загана. Чалавек добра сябе адчувае, хоча быць актыўным і гэта добра. Але давайце параўнаем беларускіх пэнсіянэраў, напрыклад, з польскімі. Там пасьля сыходу на заслужаны адпачынак працягвае працаваць 12% пэнсіянэраў. Гэта ў два разы менш, чым у нас. Сярэдняя велічыня пэнсіі ў Польшчы — амаль 400 даляраў. Розьніца і ва ўзроўні жыцьця, і ў падыходзе да жыцьця.

На думку эканамістаў, беларуская пэнсійная сыстэма — адна з самых неэфэктыўных ў сьвеце, і патрабуе карэнных зьменаў, заявіў у інтэрвію тэлеканалу Белсат эканаміст Леанід Заіка. Вось гэтыя 25% пэнсіянэраў на працы — гэта ўсяго толькі статыстыка ці нейкі небясьпечны званочак для эканомікі і дзяржавы?

Глод: Зразумела, што беларускія пэнсіянэры працуюць не ад добрага жыцьця. Вельмі ўсё дорага каштуе. Усё ж даражэе далей, літаральна штодня. Таму вялікая колькасьць пэнсіянэраў, нягледзячы на ўжо заслужаны адпачынак, працягвае працаваць, зарабляючы на больш-менш годнае жыцьцё. Паводле Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, у Беларусі працуюць прыкладна 665 тысяч асобаў пэнсійнага веку. Тут адметна, што яшчэ шэсьць гадоў таму такіх было амаль удвая менш. Бо тады пэнсіі былі больш важкімі.

Цяпер жа нават тыя пэнсіянэры, што знаходзяць яшчэ сілы працаваць, напэўна не пахваляцца заможным жыцьцём. Бо галіны, у якіх застаецца найбольш асобаў пэнсійнага ўзросту, — гэта адукацыя, сацыяльныя паслугі ды ахова здароўя. Гэта тыя, дзе найменшыя заробкі ў краіне.

А пэнсіянэры, якія жывуць на мінімальную пэнсію, могуць трапіць у катэгорыю тых асобаў, якія жывуць каля мяжы беднасьці ці ўжо за ёй. Зьмяншэньне пэнсіі ў тых, хто працягвае працаваць, экс-міністар працы і сацыяльнай абароны Аляксандр Сасноў лічыць цалкам верагодным. У краіне няма грошай, эканоміка не працуе, а праводзіць рэформы кіраўнікі ня хочуць праз боязь страціць уладу. Яны шукаюць любыя варыянты каб зэканоміць грошы. Таму дзіўна, што ходзяць чуткі толькі аб 40%. Я думаю, што могуць наагул перастаць плаціць пэнсію пэнсіянэрам, якія працуюць.

Карней: Уладзімер Уладзімеравіч Глод, уласна кажучы, якраз і ўяўляе прыклад працуючага пэнсіянэра і, пэўна, як ніхто ведае, ці рэальна паўнавартасна існаваць зь цяперашняй беларускай пэнсіі.

Калі Аляксандр Лукашэнка ініцыяваў непапулярнае рашэньне падвысіць пэнсійны ўзрост, у якасьці аргумэнту агучвалася наступная дылема: сыходзіць на заслужаны адпачынак раней, але грошай атрымліваць менш, ці пазьней, з захаваньнем не ніжэй за 40% ад сярэдняга заробку па краіне. Праўладныя аналітыкі пры гэтым адсылалі да лічбаў статыстыкі — маўляў, карані ў дэмаграфіі.

Цяпер у Беларусі на 100 працуючых прыходзіцца 61 пэнсіянэр. Паводле разьлікаў, у 2020 годзе суадносіны будуць ужо 100 да 66, а калі нічога не рабіць, то да 2030-га 100 працуючых павінны будуць утрымліваць 78 пэнсіянэраў. Падтрымліваць узровень пэнсій — задача ўсё больш складаная, бо, разводзяць рукамі дзяржаўныя эканамісты, у эканоміцы таксама ёсьць запас трываласьці. А павялічваць тарыфы адлічэньняў у Фонд сацыяльнай абароны — мера яшчэ больш непапулярная, чым пэнсійны ўзрост.

Нягледзячы на тое, што сёньня пэнсійныя сумы збольшага сымбалічныя і проста не даюць памерці з голаду, прыбыткі ў дзяржаўным сэктары імкліва набліжаюцца да тых ж самых 100-150 даляраў у эквіваленце. Маса прыкладаў, калі ў вёсках людзі зарабляюць удвая меней і для іх выхад не пэнсію — ледзь на адзіная магчымасьць мець невялікі, але стабільны прыбытак.

Дзьмітры Гурневіч
"Радыё Свабода"

ПРАБЛЕМЫ ЖКХ

ГУЛЬНЯ Ў ЛІЧБЫ

Улады Беларусі працягваюць стварэнне ўласнай віртуальнай рэальнасці. Але пры гэтым, падобна, не здагадваюцца, што такім чынам не толькі заганяюць сябе ў тупік, але і правакуюць сацыяльны выбух.

Падавалася б, навошта перакручваць факты і лічбы? Усё роўна людзі ходзяць па крамах, бачаць лічбы ў сваіх жыроўках, атрымліваюць разліковыя лісты… Але ўсё роўна некаму хочацца выдаць пажаданае за дзейснае альбо «прычасаць лічбы пад сваю патрэбу».

Напачатку года гэтым, найперш, занялася любімая ЖКГ. Спрабуючы апраўдаць павышэнне тарыфаў на ацяпленне ў першыя ж дні новага года на 17%, на «партале камунальнай пісьменнасці насельніцтва» (во як загнулі!) прыведзены параўнальны аналіз, колькі плацяць за цяпло беларус, і колькі суседзі — Літва, Украіна, Расія. Паводле аўтараў ад ЖКГ, мы вельмі багатыя — плацім за цяпло толькі 11% ад заробку. Тады як у Літве кошт ацяплення складае 35% ад заробку, у Польшчы — 25%, у Расіі і Казахстане — 17%, а ва Украіне і ўсе 50%.

Але, калі чытаць удумліва і паспрабаваць праверыць лічбы, атрымліваецца нешта дзіўнае. «У сённяшні час беларус у сярэднім зарабляе 720 рублёў на месяц (дадзеныя афіцыйнай статыстыкі за кастрычнік), адпаведна, доля камунальных плацяжоў пасля падаражання складзе 11% ад сярэдняга заробку», — піша на «партале» gkx.by Яна Шчука. Між тым, дадзеныя афіцыйнай статыстыкі за кастрычнік кажуць, што намінальны налічаны заробак за кастрычнік, паводле Белстата, склаў у сярэднім па краіне 6 837 568 недэнамінаваных рублёў, то бок 684 рублі. І гэта налічаны, а не атрыманы заробак.

Пры гэтым Яна Шчука нават не тлумачыць, чаму заробак за кастрычнік параўноўваецца з цяперашнімі коштамі на ацяпленне. І гэта зразумела. Па тых жа дадзеных Белстата, налічаны заробак насельніцтва ўвесь год падаў, і за лістапад гэтае падзенне склала амаль 5%. Што, безумоўна, адаб'еццa на канчатковых «працэнтах за ацяпленне», а «парталу камунальнай пісьменнасці насельніцтва» тое цалкам не патрэбна.

У артыкуле яшчэ багата спрэчных высноў і тлумачэнняў. Але сам галоўны пасыл артыкула — гэта таксама прыём маніпуляцыі. Прыём вельмі стары, які нават паспеў надакучыць. Ну, хай сабе літоўцы плацяць за кватэру 35% заробку, а ўкраінцы 50%. І што? Мне што, павінна стаць цяплей ад таго, што нехта жыве ў іншай краіне і плаціць за камуналку больш? Выбачайце, але гэта — перакручаная логіка, якую нават логікай назваць цяжка. А дзе лічбы, колькі мы плацім за харчаванне?

Дарэчы, пра Белстат. Паводле гэтай канторы, інфляцыя ў Беларусі склала за год 10,6%. Некаторыя чыноўнікі ўжо паспелі заявіць, што яна набліжаецца да «адназначнага працэнту».

Працэнты — працэнтамі, але чаму мы не бачым гэтага ў крамах? Telegraf.by параўнаў пераднавагодні закупы прадуктамі на сэрвісе e-dostavka, зробленыя ў канцы снежня 2015 і 2016 гадоў. Смятана падаражэла на 46%, рыс — на 22%, макароны — на 21%, вараная кілбаса — на 18%, тварог — на 20%, квас — і той падаражэў на 46%. У інфляцыю амаль упісаўся батон, які падаражэў на 10,7%.

Пытанне — дзе існуе інфляцыя ў 10,6%? Пэўна, там жа, дзе і заробак у 720 рублёў, і «ўсім па піццот» у гэтым годзе.

Такім чынам, шараговы чалавек чытае справаздачы Белстату і ЖКГ пра тое, як у нас усё добра, а ў суседзяў дрэнна. А потым ідзе ў краму і ў яго адбываецца «разрыў шаблону». Калі ў нас усё добра, дык чаму ўсё так дорага? Зразумела, у яго ўзнікае злосць — за падман, за перакручванне фактаў. І глеба для сацыяльнага выбуху — гатовая.

…І галоўны паказчык таго, што будзе горш, — скарачэнне дзяржпадтрымкі тым самым прадпрыемствам, пра становішча якіх мы больш не даведаемся. Сёлета дзяржава вырашыла выдаць толькі 1,9 мільярда рублёў дырэктыўных крэдытаў. У мінулым годзе гэты ліміт быў устаноўлены на ўзроўні 2,8 мільярда рублёў. То бок, дзяржпадтрымка скарачаецца аж удвая!

Грошай няма. Трымайцеся.

(скарочана)

Сяргей Салаўёў
«Новы час»

ДЭМАГРАФІЯ

ЧИНОВНИКИ ТАЩАТ БЕЛОРУСОВ В ПОСТЕЛЬ

У населения Беларуси стали заметны черты так называемого «европейского» репродуктивного поведения. Беларусь нацелена на увеличение рождаемости. Реально ли это в краткосрочной перспективе с учетом экономических реалий и уменьшения числа женщин в детородном возрасте?

«Обеспечить воспроизводство населения»

Цель правительства — увеличить средний суммарный коэффициент рождаемости с 1,72 до 2,0, сообщил на пресс-конференции в Минске заместитель министра труда и социальной защиты Александр Румак.

Средний суммарный коэффициент рождаемости в демографии считается определяющим и показывает, сколько детей в среднем родила бы женщина на протяжении всего репродуктивного периода (от 15 до 50 лет) при сохранении половозрастной рождаемости на уровне того года, для которого вычисляется показатель.

«Мы нацелены на увеличение этого коэффициента для того, чтобы обеспечить воспроизводство населения», — сказал Румак.

Он напомнил, что по итогам девяти месяцев 2016 года в Беларуси впервые за последние 20 лет зафиксирован естественный прирост населения — +518 человек.

«Это очень большое достижение, — отметил замминистра. — И такой прирост стал результатом социальной политики по поддержке материнства и семей с детьми, которая реализовывалась на протяжении последних лет».

Сегодня в стране 57% новорожденных — вторые и последующие дети, и этот процент растет, отметил замминистра. Семьи с двумя детьми сейчас составляют 28% среди всех семей с детьми.

На европейском фоне

В развитых странах при современном уровне смертности простое замещение поколений достигается при коэффициенте суммарной рождаемости, равном 2,1.

Меньше рожать детей — это не просто европейский, а мировой тренд. Коэффициент суммарной рождаемости населения мира в целом сократился с 4,95 в первой половине 1960-х годов до 2,67 в 2002 году. А в развитых странах в 2002 году этот показатель составлял 1,59. В настоящее время из всех развитых стран мира только в США показатель рождаемости составляет более двух детей на женщину.

По словам Александра Румака, сейчас средний коэффициент рождаемости в Беларуси выше, чем во многих европейских государствах.

Согласно данным электронного еженедельника «Демоскоп», самый низкий коэффициент в Португалии (1,23), а самый высокий — во Франции (2,01). Высокие значения коэффициента отмечаются в Ирландии (1,94), Швеции (1,88) и Великобритании (1,81). Крайне низкие значения суммарной рождаемости уже в течение многих лет отмечаются не только в Португалии, но и в Греции, Польше, Испании, Италии, Словакии, на Кипре и Мальте (менее 1,4 ребенка на женщину)…

Второй ребенок важнее первого?

Минтруда и соцзащиты планирует увеличить коэффициент за счет кардинального изменения политики планирования семьи, мотивации молодежи на создание семьи и рождение детей, формирования установок на более раннюю реализацию репродуктивной функции.

Говоря о соцподдержке семей, Александр Румак отметил господдержку многодетных семей в решении жилищных вопросов, изменение подходов при назначении пособий по уходу за детьми и их размера.

По словам замминистра, за два года реализации программы долгосрочной поддержки многодетных семей (семейный капитал) было открыто 28 824 депозитных счета на общую сумму более 288 млн долларов. По словам Румака, основная часть счетов — 17 242 — была открыта в 2016 году.

Очевидно, что в Беларуси активно поддерживают рождение вторых и третьих детей.

Помимо вышеупомянутого семейного капитала, который начисляется при рождении, усыновлении (удочерении) третьего или последующих детей в период с 1 января 2015 года по 31 декабря 2019 года, в стране есть другие преференции для тех, у кого больше одного ребенка.

Например, пособие при рождении первого ребенка — 10 величин бюджета прожиточного минимума, при рождении второго ребенка и последующих детей — 14.

Ежемесячное пособие на первого ребенка — 35% среднемесячной зарплаты в стране, на второго и последующих детей — 40%.

Не является ли такая политика демонстрацией ценности не каждого ребенка, а их количества? И не происходит ли так, что в результате откладываются рождения первых детей?

Что касается поддержки рождения вторых и третьих детей, Сергей Рязанцев считает, что, «обычно, первого ребенка семья рожает сама, без помощи государства». Это, по его словам, программа минимум, которая не зависит от поддержки государства.

Как считает Анастасия Боброва, сегодня многим семьям действительно проще решиться на второго ребенка, чем на первого.

«Особенно непросто завести первенца и резко снизить уровень своих доходов женщинам с высокой заработной платой, которую они теряют, когда уходят в отпуск по уходу за ребенком. Поэтому в поддержке семей необходимо ориентироваться и на тех, у кого появляется первый ребенок», — считает эксперт.

По ее мнению, «поддержка может быть не материальная, а в виде создания инфраструктуры для семей. Например, стоит активнее развивать возможности гибкой занятости, создавать систему яслей для детей до года».



Анастасия Боброва уверена, что принуждать население к рождению детей неправильно: «Если в стране будут созданы соответствующие экономические условия и качественная инфраструктура, в семьях и без уговоров чиновников будет появляться больше малышей».

(скарочана)

Елена Спасюк
naviny.by

Заснавальнік і рэдактар: Гаравы Леанід Антонавіч

Адрас рэдакцыі: 211573, г. Гарадок, вул. Гагарына, д.30Б, кв.16. E-mail: 250318@list.ru Тэл. 8-02139-5-08-52, маб. + 375(29)6723842 (V), Газета выдаецца з сакавіка 1998 г.

Падпісана да друку 16.01.2017 у 18.40 Наклад: 290 асобнікаў. Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў. Друкуецца на абсталяванні аднадумцаў. Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.